# Гульня-віктарына “Святло роднага слова”

**Т. У. Сцепанюк,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 7 г. Ваўкавыска

**Мэта:** спрыяць распаўсюджванню і папулярызацыі беларускай нацыянальнай мовы праз гульнявую форму.

**Задачы:**

– садзейнічаць развіццю інтэлектуальных магчымасцей вучняў, іх творчых здольнасцей; выхоўваць любоў і павагу да роднай мовы, падтрымліваць цікавасць да яе вывучэння;

– садзейнічаць развіццю маўленчых і камунікатыўных якасцей вучняў;

– спрыяць выхаванню пачуцця павагі да мовы, адказнасці за яе лёс, падтрымліваць цікавасць да яе вывучэння.

**Абсталяванне:** папяровая кветка, карта Беларусі, выстава кніг “Беларуская палічка”, “Руска-беларускі слоўнік”, тлумачальны, фразеалагічны слоўнікі, слоўнік сінонімаў, запісы на дошцы выказванняў пісьменнікаў пра родную мову: “Мова – гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ” (І.Мележ); “Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў” (У.Караткевіч), мультыборд.

**Ход мерапрыемства**

Хай святло навукі яснай
Заблішчыць, як сонца ўсход,
Няхай родным словам шчасным
Загаворыць наш народ.

Я.Колас

**Настаўнік.** Добры дзень, дарагія сябры. Я вельмі рада бачыць вас і з вялікім задавальненнем запрашаю прыняць удзел у мерапрыемстве “Святло роднага слова”. Сёння будзе гучаць напеўнае беларускае слова, вы будзеце выконваць розныя заданні. За правільны адказ атрымаеце частку карты Беларусі. Ваша задача: сабраць усе часткі, правільна іх размясціць і прачытаць зварот Ф. Багушэвіча да баларусаў. А пачаць мне хочацца з верша Пятра Бітэля.

Любіць сваё – зусім не значыць
Чужое ганіць, адмаўляць.
Вось за чужым свайго не бачыць,
Не вывучаць, не шанаваць –
Злачынствам будзе без сумлення,
Бо ёсць такі закон жыцця:
Шануй чужое аж да пакланення,
Сваё любі да самазабыцця.

Мы — беларусы. Нас называюць памяркоўнымі, гасціннымі, шчырымі людзьмі. Беларусы вылучаюцца сваёй знешнасцю (светлыя, ільняныя валасы, блакітныя вочы), ветлівай усмешкай на вуснах і мілагучнай, напеўнай мовай.

Мова – частка чалавечай культуры, гістарычнай спадчыны. Дзякуючы ёй працягваюць жыць традыцыі. Мова абуджае цікавасць да пазнання свету, садзейнічае праяўленню павагі да нашага мінулага і служыць элементам аб’яднання людзей незалежна ад месца і часу іх пражывання.

Сёння ў свеце шмат цудоўных моў. Адны з іх вабяць сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю, другія – мілагучнасцю. Але ў кожнага чалавека ёсць толькі адна родная мова. Менавіта на гэтай мове ён размаўляе з роднымі, сябрамі, знаёмымі. І вельмі дрэнна, калі чалавек пачынае забывацца на сваю мову, не шануе яе.

**Заданне 1.** На экране вы бачыце спіс моў. Выпішыце тыя, якія не існуюць. На якіх мовах на самой справе размаўляюць у гэтых краінах?

Аўстралійская, аўстрыйская, англійская, армянская, беларуская, іспанская, канадская, кубінская, латвійская, літоўская, польская, партугальская, расійская, украінская, шведская, французская.

*(Адказ: аўстралійская - англійская; аўстрыйская – нямецкая; канадская – англійская і французская; кубінская – іспанская; латвійская – латышская; расійская – руская)*

**Настаўнік.** Добра справіліся з заданнем. Вось ваша першая частка карты. Вядома, што кожны месяц знікаюць 2 мовы. Яшчэ нядаўна налічвалася да 8000 самастойных моў. Сёння іх на 2000 менш.

Перад вамі “воблака слоў”. Я прапаную вам выбраць словы, словазлучэнне, якімі можна ахаратарызаваць, апісаць нашу мову. Для мяне беларуская мова – пяшчотная. А якая яна для вас? *(Настаўнік перадае па крузе кветку, і вучні па чарзе агучваюць свае прыклады: прыгожая, напеўная, мілагучная, вобразная, сакавітая, сонечная, дарагая, бацькоўская, звонкая, непаўторная, адзіная ў свеце, ласкавая, любімая, мілая, магутная…)*




**Настаўнік.** Малайцы! Вы адчуваеце, як адразу стала святлей ад такіх цёплых слоў?

Дзякуючы беларускім паэтам і пісьменнікам наша мова жыве і развіваецца. А якія словы яны знаходзяць, каб выказаць сваю любоў да роднага слова?

**Паэтычная хвілінка.** *(Вучні чытаюць вершы беларускіх мастакоў слова)*

**Вучань 1.**

Цёплыя словы – сонца і хата.
Лепшыя словы – мама і тата.
Смачныя словы – хлеб і суніцы,
Росныя словы – кветкі, крыніца.
Чулыя словы - сын, калыханка,
Ясныя словы – лета і ранак.
Мудрыя словы – жыта і поле,
Светлыя словы – вецер і воля.
Даўнія словы – водгулле, род,
Гордыя словы – звон і народ. (Т. Мушынская)

**Вучань 2.**

Без мовы няма той краіны,
У якой нашы продкі жылі.
Як няма без вады расліны,
Як няма без раслін зямлі.
Як няма без гісторыі краю,
Як няма жыцця без надзей.
Мову родную ў сэрцы я маю
І нясу яе да людзей. (Павел Мітар)

**Вучань 3.**

У нас сваіх хапае слоў
Крамяных,
росных,
васільковых
Ад мурагоў і ад лясоў,
Ад светлых высяў жаўруковых.
У нас хапае слоў сваіх

(Іх пазычаць няма патрэбы)

Ад чыстых даляў веснавых,

Ад глыбіні ўлетку неба.

Яны ўвабралі звон крыніц,

Шум лесу і дыханне ночы...

Ад ліўняў і ад навальніц –

Грымяць, іскрацца і шапочуць.

Журыцца ўмеюць і звінець,

Спяваць у шумным карагодзе.

Іх трэба сэрцам разумець

І ўмець знаходзіць у народзе. (Ю. Свірка)

**Настаўнік.** Мы прыйшлі ў кнігарню з мамай.

На паліцах — безліч кніг!

Тоўстых, тонкіх — розных самых,

Цэлы свет — у кніжках тых!

А скажыце мне, калі ласка, акрамя кнігарні, дзе яшчэ мы можам бачыць безліч кніг? *(Адказы вучняў)* Так, у бібліятэцы. У народзе кажуць: “З кнігай павядзешся – розуму набярэшся”. Паглядзіце на беларускую палічку. Яна пакуль пустая. Але колькі цікавых кніг на беларускай мове прапануецца для чытання!? Давайце пазнаёмімся з некаторымі з іх. *(Рэклама кніг на беларускай мове)*

**Вучань 1.**

У Вольгі Гапеевай ёсць кніга «Дзве Авечкі». Авечак шмат не бывае! Асабліва такіх мілых. Асабліва ў вершах. А ўжо калі авечкі з Беларусі і Панда з Шанхаю — бяспройгрышная камбінацыя. Некаторыя часткі абавязкова захочацца вывучыць на памяць. А некаторыя — падправіць. Тэкст не вельмі роўны, але вельмі смачны. Як кавуновы сок.

**Вучань 2.**

У зборніку “Нататкі таткі” Андрэя Хадановіча сабраны вершы на ўсе выпадкі жыцця. Трэба пайсці пакарміць качак, пагайдацца на арэлях ці

паехаць у грыбы – калі ласка. Трэба паплёскацца ў ванне, але без патопу і каб за сабой потым прыбралі – штось напісалася. Звярнулі ўвагу, што цукеркі ядуцца лепей за боршч – трэба ратаваць сітуацыю.

У зборніку сабраны вершы пра катанне на каньках і на веласіпедзе. Пра першы паход у школу. Пра суровы рэжым дзіцячага жыцця ды розныя складанасці выхавання.

У мяне бацькі – звяры:

Абуджаюць на зары…

**Вучань 3.**

Як сябраваць, каб было па-сапраўднаму? Як бараніць сябе і сяброў? Як гуляць так, каб было ўсім цікава? Як жыць з гэтымі дарослымі і не крыўдаваць на іх? Як прызнаваць свае памылкі і ці трэба іх прызнаваць? Ці можна плакаць, калі табе надта крыўдна? І як зрабіць так, каб нікому крыўдна не было? Вось такія няпростыя пытанні вырашае галоўная гераіня кнігі Валерыя Гапеева “Жэнька – каралева мышак”. Дзяўчынка абавязкова стане вашай сяброўкай.

**Вучань 4.**

А ёсць у нашай бібліятэцы кнігі замежных пісьменнікаў, перакладзенія на беларускую мову. Вось адна з іх.

Твор “Роня, дачка разбойнікаў” Астрыд Ліндгрэн — пра сталенне, час, калі дзіця пачынае шукаць самастойны шлях у жыцці, пра любоў і каханне, вернасць, адвагу, пра тое, як лёгка ўсё разбурыць праз дробязі, і пра каштоўнасць жыцця. Але адначасова і пра вясёлыя прыгоды, бо галоўныя героі ўсё яшчэ дзеці. Яны прыручаюць дзікіх коней, жывуць у пячоры пасярод дзікага лесу. Таму для маленькіх чытачоў гэта чароўная казка, для старэйшых — нагода задумацца пра сапраўды каштоўныя ў жыцці рэчы.

Пераклад са шведскай мовы на беларускую зрабіла Надзея Кім.

**Вучань 5.**

Яшчэ адзін перакладны твор – “Калядная каша” Свэна Нурдквіста. Калядная казка пра гномаў і кароткую чалавечую памяць. Добра, што нават ма-

ленечкія істоты могуць мець вялікае сэрца. Яшчэ лепш, калі героі ўспамінаюць, як важна быць добрым і ўважлівым да маленькіх памочнікаў.

Пераклад зрабіла Надзея Кандрусевіч.

**Вучань.** Сэрцы, нібы дзверы,
Можна адмыкаць,
Трэба толькі ведаць,
Дзе ключы шукаць.
«Калі ласка», «Дзякуй» —
Вось яны, ключы!
Ты іх, калі ласка,
Добра завучы. (А. Стодарт)

**Настаўнік.** Скажыце, вам хацелася б, каб людзі, якія жывуць побач, адчувалі вашу павагу, любоў? У беларускай мове ёсць шмат слоў, якія змогуць узняць настрой вашаму суразмоўцу, дапамогуць быць ветлівым, культурным, інтэлігентным чалавекам.

**Заданне 2.** Прачытайце на экране словы ветлівасці. Выпішыце спачатку словы, якімі вітаюцца, потым словы, якімі развітваюцца. Асобна выпішыце словы-пажаданні.

Добры дзень! Добры вечар! Лавіся, рыбка, малая і вялікая! Да пабачэння! Будзьце здаровенькі! Вітаю Вас! Удачы, шчасця вам! Прывітанне! Рады быў Вас бачыць! Дзень добры ў хату! Шчасліва заставацца! Добрага ранку! Наша вам шанаванне! Да сустрэчы!

*(Адказы: 1. Добры дзень! Добры вечар! Вітаю Вас! Прывітанне! Дзень добры ў хату! Добрага ранку!*

*2. Да пабачэння! Рады быў Вас бачыць! Шчасліва заставацца! Да сустрэчы!*

*3. Лавіся, рыбка, малая і вялікая! Будзьце здаровенькі! Удачы, шчасця вам! Наша вам шанаванне!)*

**Настаўнік.** Жывіце радасна, лёгка, карыстайцеся словамі ветлівасці. А наша мова вас пачула і ўсміхнулася. Атрымайце яшчэ адну частку карты.

**Вучань.** Пагавары са мной на мове,
На нашай роднай, не чужой.
Адчуеш ты – у кожным слове
Душа яднаецца з душой.
У словах тых – надзеі нашы
І нашы мары пра жыццё.
Калі мы з мовай –
Нас не страшыць
Ні гвалт, ні мор, ні забыццё.
Пагавары са мной на мове,
Забудзь на час пра “языкі”.
Няхай гучаць у кожным слове
І продкі нашы, і вякі! *(І. Пракаповіча)*

**Настаўнік.** Неяк на вуліцах нашых гарадоў з’явілася сацыяльная рэклама, якая папулярызавала беларускую мову з дапамогай... ягад. Гэта білборды з серыі «Смак беларускай мовы». На фотаздымках ягады на белым фоне, якія суправаджаюцца подпісамі на беларускай мове і словамі-адпаведнікамі на рускай мове.

Кіраўніцтва прадпрыемства «Белзнешрэклама» патлумачыла свой выбар так: «Беларуская мова мае непараўнальную чароўнасць, сакавітае гучанне, спецыфічны каларыт, гэта сапраўды ўнікальная мова, самая мілагучная і самая старажытная сярод славянскіх моў».

Калі ў нас узнікаюць пытанні адносна значэння слова, яго правапісу або перакладу, мы звяртаемся па дапамогу да... *(Адказы вучняў.)* Так, да слоўнікаў.

**Заданне 3.** Назавіце ягады па-беларуску. (На экране дэманструюцца фотаздымакі ягад.) Які слоўнік вам дапаможа без памылак справіцца з гэтым заданнем? *(Руска-беларускі.)* Так, правільна.

арбуз — … (*кавун)*

ежевика — … (*ажыны)*

шиповник — … (*шыпшына)*

крыжовник — … (*агрэст)*

клюква — … (*журавіны)*

земляника — … (*суніцы)*

красная смородина – … (*чырвоныя парэчкі)*

голубика - … (*буякі)* (Дадатак 1)

Дадатковыя пытанні:

1. А калі вам неабходна даведацца пра значэнне слова, якім слоўнікам будзеце карыстацца? *(Тлумачальным.)*

2. Да якога слоўніка трэба звярнуцца, каб праверыць правапіс? *(Да арфаграфічнага.)*

3. З дапамогай якога слоўніка можна падабраць сінонімы? *(З дапамогай слоўніка сінонімаў.)*

4. Які слоўнік дапаможа вызначыць значэнне фразеалагізма? *(Фразеалагічны.)*

**Настаўнік.** Добра папрацавалі. Вось вам даю частку карты. А цяпер прапаную трошкі адпачыць і паглядзець мультфільм "Як сінячок да сонца лётаў" вытворчасці кінастудыі "Беларусьфільм". Гэта стужка трапіла ў конкурсную праграму найбуйнейшага фестывалю анімацыйнага кіно CAIRO ANIMATION FORUM, які праходзіў у Егіпце. Анімацыя створана па аднайменнай казцы Уладзіміра Дубоўкі (https://www.ivi.ru/watch/465625).

**Мультпаўза.** *(Прагляд мультфільма "Як сінячок да сонца лётаў*".)

- Якой паказана птушка ў мультфільме? *(Адказы вучняў.)*

- Чаму вучыць гэта гісторыя? *(Адказы вучняў.)*

А мы крочым далей. Крынічнымі словамі, залацінкамі мудрасці называюць прыказкі. У народзе кажуць: “Усяму пачатак роднае слова”. Давайце вызначым, якое значэнне маюць наступныя словы.

**Заданне 4.** Беларуская мова багата на цікавыя словы, але некаторы з іх не часта пачуеш у размове. Растлумачце сэнс беларускіх слоў: выберыце з 4 прапанаваных варыянтаў адзін правільны.

***гузік***

*малаток* *зашпілька*

*сіняк* *птушаня*

***чарот***

*рыба* *расліна*

*танец* *народ*

***патэльня***

*шыя* *дошка*

*скаварада* *рука*

***жырандоля***

*талерка* *дошка*

*вядро* *люстра*

***апалонік***

*далонь* *палка*

*лыжка* *гаршчок*

**Настаўнік.** Малайцы. Важна памятаць: словам можна парадаваць, падняць настрой, а можна і пакрыўдзіць. Будзьце ўважлівымі адзін да аднаго. Далучыце гэту частку да карты.

Наша мова вобразная і эмацыянальная. А дасягаецца гэта вобразнымі сродкамі мовы, а таксама выкарыстаннем непадзельных, устойлівых спалучэнняў слоў, якія ўжываюцца ў маўленні як адзінае цэлае. Як называюцца гэтыя спалучэнні слоў? *(Адказы вучняў)* Так, фразеалагізмы. На экране дэманструюцца выразы.

**Заданне 5.** Вызначце, якія беларускія фразеалагізмы “склеіліся” і назавіце іх (значэння тлумачыць не трэба).

*Падказка: у кожным прыкладзе па два фразеалагізмы, напрыклад:*

*Маўчаць як рыба аб лёд = маўчаць як рыба + біцца як рыба аб лёд*

1. Адна галава тут, другая – там
2. Жаба на языку круціцца
3. Кашы ў рот набраўшы
4. Куды вочы нясуць
5. Як кот языком злізаў

*Адказы:*

*Адна нага тут, другая – там + Адна галава добра, а дзве лепш.*

*Жаба на языку не спячэцца + На языку круціцца.*

*Каша ў галаве + Як вады ў рот набраўшы.*

*Куды вочы глядзяць + Куды ногі нясуць.*

*Як кот наплакаў + Як карова языком злізала.*

**Настаўнік.** Справіліся і з гэтым заданнем. Цудоўна! Вось ваша частка карты. Прапаную выканаць яшчэ адно заданне.

**Заданне 6.** Закончыце сказы

1. Раніцай мы снедаем, а ўвечары… (вячэраем.)

2. Сёння нядзеля, а заўтра… (панядзелак.)

3. Чацвёрты дзень тыдня … (чацвер.)

4. Чэрвень, ліпень, жнівень – гэта … (летнія месяцы.)

5. Месяц, у якім цвітуць верасы, – … (верасень.)

**Настаўнік.** Сябры, вы добра працавалі сёння. Дзякую вам за гэта. Бярыце апошнюю частку. Карта сабрана (Дадатак 2). Давайце прачытаем важныя словы Ф. Багушэвіча. (*Вучань чытае)* Як вы іх разумееце? *(Адказы вучняў)*

Спадзяюся: шчырыя, сардэчныя і цёплыя словы беларускай мовы будуць гучаць з вашых вуснаў і ўпрыгожваць жыццё. Паслухайце наказ, які дае кожнаму з нас В. Шніп. (*Вучань чытае верш В.Шніпа "Дзесяць запаведзяў")*

**Вучань**. Мову родную беражы.

Мовай роднаю даражы.

Мову родную шануй.

Мовай роднай не гандлюй.

Мову родную любі.

Мовы роднай не кідай.

Мову дзецям перадай.

Мовы не аддай на здзек.

Толькі з ёю жыцця век.

**Настаўнік.** Нам у спадчыну засталася мова продкаў-беларусаў — жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная. Дык давайце будзем берагчы яе, вывучаць і карыстацца ёю. Хай заўсёды гучыць мова роднай зямлі, мова беларускага народа.

*Гучыць песня «Беларуская мова» (сл. Л.Пранчака, выконвае гурт “Дразды”, відэаролік)*

Дадатак 1

      



Дадатак 2




Вучаць у школе замежныя мовы,
Кожная мова гучыць адмыслова.
Вы паглядзіце – у краіне любой
Ёсць да айчыннага слова любоў.
Шчыра гаворыць француз па-французску,
Рускі прасветлена мовіць па-руску.

Піша ад сэрца па-польску паляк.

Як мы да роднае ставімся? Як?

О, загучы, як Радзімы аснова,

Ты, беларуская слынная мова!

Англійская мова мне добра даецца,

А да беларускае цягнецца сэрца.

Яе, нібы шчасце, пушчу ў душу.

-Дзень добры, любімая мова,-кажу.

Скажыце, дарослыя, сталыя людзі,

Няўжо нашу родную мову забудзем?

Часцей і паўсюдна на ёй гаварыце,

Багацце яе нам, нашчадкам, дарыце.

Яна, нібы зорачка ранняя, свеціць,

Усім сталым людзям, дарослым і дзецям.

Вобразная, вольная, пявучая, Мова беларуская мая!

*Пімен Панчанка.*

2) Мілая, адзіная Нам, нашчадкам, дадзена Любаю радзімаю Ад дзядоў і прадзедаў.

*Уладзімір Мазго.*

3) Магчыма, гэта і не нова, Што слова — зерне на сяўбе, А хто не любіць роднай мовы, Той любіць толькі сам сябе...

*Сяргей Грахоўскі.*


21 лютага
Міжнародны дзень роднай мовы

Роня,
дачка разбойніка
Астрыд Ліндгрэн

Андрэй Хадановіч

БЕЛАРУСКАЯ
МОВА-МЕЛОДЫЯ
СЭРЦА

Жэнька — каралева мышак

КАЛЯДНАЯ КАША
Свэн Нурдквіст

